**Канцавая Г.М.**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Брэсцкага
дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна

# «ЯК ДРЭВЫ, РАСТУЦЬ УСЕ СЛОВЫ…» (ПАЎТАРАЕМ МАРФЕМІКУ І СЛОВАЎТВАРЭННЕ)

У сучаснай школе, як адзначаюць аўтары «Методыкі выкладання беларускай мовы» В.А. Ляшчынская і З.М. Шведава, марфемны склад і словаўтварэнне вывучаюцца ў некалькі этапаў:

- пачатковы, калі элементарныя звесткі аб будове слова вучні атрымліваюць ужо ў пачатковых класах;
- сістэматычны, калі ўсе пытанні раздзела вывучаюцца ў адпаведнасці з лінейным прынцыпам праграмы курса;
- спадарожны, калі пытанні раздзела спалучаюцца з вывучэннем усіх раздзелаў курса;
- заключны, калі работа па вывучэнні марфемікі і словаўтварэння прадаўжаецца ў выглядзе паўтарэння і абагульнення, работы над стылістычнай афарбоўкай слова, афіксаў у яго складзе, вызначэння паходжання слова і інш.

Раздзел «Марфеміка. Словаўтварэнне» даволі складаны для вучняў. Школьнікам цяжка выдзяляць марфемы ў слове, так як многія з вучняў адносяцца да слова як да набору марфем, ігнаруючы цалкам сэнсавыя характарыстыкі слова. Школьнікі думаюць над тым, як выдзеліць асобныя структурныя часткі слова. Яны больш абапіраюцца на знешнюю падобнасць якіх-небудзь частак розных слоў, на асацыятыўныя сувязі, што ўзнікаюць звычайна зусім нечакана. Аднак пры марфемным аналізе слова неабходна ўлічваць не толькі адносіны «марфема–марфема», але і адносіны «вытворнае слова – утваральная аснова».

За гады навучання ў школе ў вучняў павінна быць сфарміравана ўменне разбіраць слова па саставе з улікам значэння марфем і асаблівасцяў утварэння слова, атрымліваць з канкрэтнай марфемы, з мадэлі, па якой пабудавана слова, неабходную інфармацыю пра яго – пра яго лексічнае значэнне, будову, граматычныя прыметы і напісанне.

Па-першае, вучні павінны зразумець, што марфема – значымая частка слова; па-другое – навучыцца размяжоўваць працэсы форма- і словаўтварэння; па-трэцяе – ведаць паслядоўнасць разбору слова па саставе; па-чацвёртае – навучыцца бачыць словы, у якіх ёсць чаргаванні галосных і зычных у корані; выпрацаваць уменне карыстацца спосабам аналізу: значэнне слова → будова слова → правапіс.

Штогод заданні па марфеміцы і словаўтварэнні ўключаюцца ў цэнтралізаванае тэсціраванне і выклікаюць пэўныя цяжкасці ў школьнікаў. Прапануем практыкаванні, якія дапамогуць вучням паўтарыць асноўныя звесткі па словаўтварэнні і марфеміцы і замацаваць тэарэтычныя веды на практыцы.

**1.** Вызначце канчаткі ў наступных словах. Пакажыце, паказчыкамі якіх граматычных формаў яны з'яўляюцца.

Лопух, смеласць, дождж, музей, боль, школ, армій, думак, ліній, частак, касцей, мышэй, зёлак, дзвярэй, імён; малады, лясная, добрае, алавяную, гатоў, згодная, згодзен, мілы, міл, ясны, ясен; адзін, двума, дваімі, трыма, чатырма, чацвярымі, сямю, семярых, сорак, трыццаццю, пяццюдзесяццю, двумастамі, двухсот; чый, ён, яна, нас, вамі, мой, хтосьці, кімсьці, чаму-небудзь; апранаецца, кусаюцца, шэпчацца, калышуцца, вучышся, насядзіцца, накрычыцца, блукала, стукалася, адкрываў, дазваніўся, купаліся, стрыжацеся, вучуся, ясі, ясце, дасць, дасце; праведзеная, зроблены.

**2.** Ці ёсць канчаткі ў наступных словах?

Кашпо, мадам, салямі, кенгуру, лобі, авеню; весела, даходліва, хутка, густа, вобразна, вольна; ідучы, прыехаўшы, адпачыўшы, носячы, прывёзшы, гаворачы; месці, пячы, стрыгчы, успамінаць, маляваць; раскалоцца, разбягацца, перабірацца, апранацца, смяяцца, злавацца.

**3.** У якой групе слоў запісаны словы з нулявым канчаткам, а ў якой – словы, якія не маюць канчаткаў?

1) Цудоўна, ідучы, збіраць, хадзіць, паглядзеўшы, унізе, дадому, раптоўна, адзінока, праславіць, нагаварыўшыся, углядацца, займацца, стрыгчы, плесці, збіраючыся, уверх, штоночы, метро, пані, рагу.

2) Збіраўся, дуб, станцый, прынёс, весел, люб, рад, смеласць, кветак, звёзд, падаў, стрыжань, сорак, адзін, дзевяць, пяцьдзесят, восемсот, наш, чый.

**4.** Выпішыце словы, якія маюць вытворныя асновы, абазначце ў іх марфемы.

Адмова, адмоўна, сподак, касцяніца, праўда, касцяны, паказ, ледзянец, ледзянець, чыгунка, чыгунок, падвода, лістоўніца, лістоўка, мястэчка, мясціна, нарыс, нарысаваць, мужык, скруха, празрысты.

**5.** Абазначце корань у кожным слове. Вызначце, якія гукі чаргуюцца ў каранях слоў.

Прывыкаць – прывычка; цвет – цвісці, язда – ездзіць – езджу – паездка; вецер – вятры – ветру; сон – сну; ляпіць – лепка – ляплю; вучыць – навука; прасіць – прашэнне – запрошаны – просьба; свет – світанне – свяціць; рака – рэкі – рачны; смех – усміхацца – смяшынка – усмешка; касіць – пакосы – скошаны.

**6.** Вызначце карані ў наступных словах. Якая з'ява назіраецца ў корані слова?

Адпраўленне, асляпляльны, кармленне, услаўленне, графленне, узноўлены, расслабленасць, стомлены, зарубліванне.

**7.** Ці з'яўляюцца прапанаваныя словы кожнай пары роднаснымі? Дакажыце сваё меркаванне.

Радасць – радок; хвалісты – усхваляваны; вінаваты – вінны; гараваць – гарэць – гарысты; гадавы – згадзіцца; паўдарогі – дарагавізна; купацца – пакупка; кубічны – кубінец; курыны – курэнне; ліпавы – ліпучка, марак – змарыць; ранак – параніць; вугалёк – вугалок; цэлы – прыцэліцца; рабаванне – рабаваты; гартаць – гартаваць.

**8.** Вызначце, як утвораны формы слоў.

Горшы, спаканейшы, дужэйшы, найлепшы, найпрыгажэйшы; прынеслі, узышло, намаляваў, падзякавалі; намаляваная, куплены, узнагароджаны, вымытыя, пасівелы; прынёсшы, скасіўшы, сплючы, беручы, гамонячы, гаворачы; лепш, вышэй, радзей, найбліжэй, найменш.

**9.** Размяжуйце словы з форма- і словаўтваральнымі суфіксамі (прыстаўкамі).

Палявы, перапісаць, мацнейшы, мацнець, горшы, дабрыня, чытач, найхутчэй, салаўіны, найцікавейшы, расло, прыгажэйшы, лепей, вёў, вяла, беглі, бярэзнік, гаманлівы.

**10.** Размяжуйце формы слова і аднакаранёвыя словы.

1) Гара, гарысты, узгорак, горны;
2) вясёлы, весела, вяселле, весяліцца;
3) прыморскі, прыморскаму, прыморскія, прыморскае;
4) лета, па-летняму, летні, летаваць;
5) добра, лепш, найлепей;
6) пражылі, пражыла, пражыў, пражыло;
7) бель, белы, пабяліць, пабелка;
8) праспявалі, праспяваўшы, праспявала, праспяваная;
9) вясна, вёсны, вясны, вёснамі;
10) прачытаюць, прачытала, прачытае, прачытаем.

**11.** Растлумачце значэнні слоў шляхам падбору найбліжэйшых роднасных. Пры дапамозе якіх афіксаў яны ўтварыліся?

Лыжны, жыццёвы, капітанскі, капанне, заснавальнік, зарэчны, дзікун, дзюдаіст, гусяня, вішаннік, адпраўка, выплата, кліматычны, праектаваць, рыцарскі, скалісты, сінеча, таямніца, утроіць.

**12.** Вызначце, якое слова ад якога ўтворана і пры дапамозе якога афікса.

Падпіска, падпісаць; рамантаваць, падрамантаваць; асіннікавы, асіннік; безнадзейна, безнадзейны; беззаганны, беззаганнасць; гнеўны, гнеў; намалаціць, намалот; вялікі, веліч; выбар, выбраць; гаманіць, гамонка; пяць, пяты.

**13.** Пакажыце, як утварыліся словы.

Геолаг, грузчык, выкладчык, выхавальнік, стваральнік, пясняр, гандляр, лекар, шавец, каваль, трактарыст, біятланіст, вадзіцель, паштальён, мадэльер, гастралёр, гвардзеец, гуртковец, варатар, паромшчык, вайсковец, ганец, варажбіт, весяльчак, веяльшчык, выбаршчык, віноўнік, вучань, канкурсант, касір, крыўдзіцель.

**14.** Замяніце спалучэнні слоў адным словам. Які спосаб утварэння вы выкарысталі?

Станавіцца цёмным; жыхар Мінска; дзіцяня слана; гняздо бусла; станавіцца больш моцным; праведзены без сну; стаць бледным; у колькасці сямі чалавек; які мае крылы; здольны рухацца; выхаванец ліцэя, спецыяліст па вырабе лякал; з'явіцца сімвалам чаго-небудзь; служачы таможні; засцілацца туманам; апусціцца на зямлю; які не праяўляе клопату.

**15.** Вызначце, ці аднолькавую прыстаўку маюць словы.

Адамкнуць, адарыць, адасобіць, адагнаць, адахвоціць, адраўнець, адобрыць, адурманіць, адумвацца, адубянець; абаронны, абаграванне, абагаціць, абымшэлы, абараць; падвоіць, падвоз; надаконны, надакучыць, надарваць.

**16.** Якім спосабам утвораны наступныя словы? У межах якой часціны мовы адбываецца такое ўтварэнне новых слоў?

Ушанаваць, утрымаць, успрыняць, укіснуць, узрыхліць, паплыць, папрасаваць, наплыць, набегчы, зарэкамендаваць, засмуткаваць, заслухаць, з'ездзіць, развезці, расставіць, падглядзець, надсячы, адсыпаць, абступіць, абстраляць; некалі, недзе, нікуды, ніяк; нешта, нехта, ніякі, нічый, контратака, суперзаданне; антынародны, нярадасны.

**17.** Вызначце, пры дапамозе якога суфікса **(-нн-, -енн-, -энн-, -анн-)** утвораны словы.

Папярэджанне, папярэджванне, утойванне, усыханне, усячэнне, усхваленне, утаймаванне, ухіленне, утрыманне, ушанаванне, уяўленне, уславленне, збліжэнне, здарэнне, паслабленне, адраджэнне, тлумачэнне, запазычанне, узнагароджанне.

**18.** Вызначце, ад асноў якіх слоў і якім спосабам утвораны словы.

Чырвань, глыб, шыр, сінь, бель, асцярога, нейтрал; звон, намалот, падыход, стук, адрыў, адліў, адлёт, адказ, адвод, выкуп, залік, замена, запас, настой, пералік, праезд, недабор; адзіны; шосты; залаты, воўчы, мядзведжы.

**19.** Вызначце, як утварыліся наступныя назоўнікі. Да якога лексіка-граматычнага разраду мы іх адносім?

Бяздзейнасць, бяздарнасць, бязвоблачнасць, бязветранасць, бяздушнасць, бясшкоднасць, бясспрэчнасць, безгрунтоўнасць, безасабовасць, безвыходнасць, бездакорнасць, беззмястоўнасць, безнадзейнасць, безудзельнасць, безумоўнасць, безуважлівасць, бескантрольнасць, бескарыслівасць, беспадстаўнасць, беспамылковасць.

**20.** Вызначце, пры дапамозе якіх суфіксаў і ад асноў якіх слоў утвораны прыналежныя прыметнікі.

Міхасёў, Васева, Алесіна, Алесева, Міколаў, цётчын, Зосін, матуліна, бацькаў, дзедаў, Пецеў, лісіны, пчаліны, буслава, камарыны, жончына, дзіцячы, хлапечы.

**21.** Да наступных назоўнікаў падбярыце патрэбныя па сэнсе прыметнікі. Вызначце ў прыметніках суфіксы.

Работа, кіёск (аптэчны, аптэкарскі); жанр, халат (байкавы, баечны); птушка, мясцовасць (балоцістая, балотная); пярсцёнак, блеск (брыльянцісты, брыльянтавы); воды, веды (грунтавыя, грунтоўныя); цэх, чарпак (разлівачны, разлівальны); выраз, артыкул (слоўнікавы, слоўны); чалавек, выхад (запасны, запаслівы); луг, голас (залівісты, заліўны); шчупак, боль (зубны, зубасты); поспех, настрой (пераменлівы, пераменны); выклад думак, занятак (даходны, даходлівы).

**22.** Вызначце, якім спосабам утвораны прыметнікі.

Заморскі, прыдарожны, прымежны, прысценны, пагадзінны, пагадовы, бясхмарны, пагранічны, безмарозны, бескарысны, бязмерны, бяззорны, прычыгуначны.

**23.** Вызначце, якім спосабам утвораны словы.

Бязвусы, безбароды, безвалосы, безгаловы, безгалосы, бязвокі, без’языкі, бязбровы, бязрогі, бяспёры, бяскрылы, неслух, уверх, просінь.

**24.** Вызначце, якім спосабам утвораны складаныя прыметнікі.

Белабокі, белабароды, белавалосы, белавусы, белагаловы, белагрывы, беладзюбы, белагруды, белазубы, беланосы, белахвосты, рэдказубы, рэдкавалосы, велікарукі, цемнабровы, цемнавокі, цемнаскуры, цёмнабароды, цемнатвары, буйналісты, шэравокі.

**25.** Размяжуйце словы, утвораныя складана-суфіксальным спосабам, і словы, утвораныя пры дапамозе суфікса.

Аднатомны, аднабаковасць, белакачанны, беларусізм, водападзельны, водалячэбны, каракуляводства, легкаплаўкі, легкадумнасць, ледакольны, лесазаводскі, кукурузаўборачны, нізкасортны, нізкасортнасць, святлолюбівасць, святлоадчувальны, землеўладальніцкі.

**26.** Вызначце, пры дапамозе якіх суфіксаў утвораны дзеепрыметнікі.

Адхілены, засеяны, адурманены, адточаны, адтоплены, адшліфаваны, аплаканы, астуджаны, асуджаны, асушаны, асэнсаваны, выгараджаны, вывеяны, вывучаны, выveраны, выгружаны, выкачаны, выкарчаваны, выкармлены, выкуплены, выкраслены, вылаяны, вылічаны, вымераны.

**27.** Вызначце, як утвораны прыслоўі.

Ушыр, углыб, увысь, увосень, збоч; умела, прыемна, коратка, даходліва; даверху, увесну, угары, знадворку; збольшага, урассыпную, зблізку, па-дзіцячы, па-нашаму, па-сяброўску; утрая, учацвярых, ушасцёх; замнога, няшмат.

**28.** Устаўце прапушчаныя літары. Паспрабуйце даказаць, што марфемны і словаўтваральны аналізы дапамагаюць папярэдзіць памылку:

а) **н** ці **нн?**

Тума..ы, сцюдзё..ы, блі..ы, будзё..ы, здараве..ы, палымя..ы, племя..ы, бадмінто..ы, бало..ы, бараба..ы, форме..ы, бая..ы, безабаро..ы, безвітамі..ы, беззага..ы, клятве..ы, вогне..ы, страшэ..ы.

б) **с** ці **сс**?

Бе..южэтны, бе..мяротны, бе..тэрміновы, бе..ардэчны, бе..хрыбетны, бе..цялесны, бя..уфіксальны, бя..форменны, бе..аромны, бя..крылы, бя..хмарны, бя..нежны, бя..колерны; ра..лабленне, ра..трэл, ра..адны, ра..яваць, ра..ольнік, ра..цілаць, ра..ыпістасць, ра..якаць, ра..яленне, ра..таваць, ра..тасаваць, ра..таптаць, ра..ядлаць, ра..ыханне, ра..ыпістасць.

**29.** Вызначце, як утвораны складаныя словы. Устаўце прапушчаныя літары і растлумачце іх правапіс.

Пуц..ўкладчык, пуц..водны, жыцц..апісальны, жыцц..радасны, зерн..сушылка, зерн..склад, сво..часовы, сва..вольны, земл..капалка, земл..мерны, ільн..пастаўкі, ільн..апрацоўка, святл..любівы,

пыл..ачышчальнік, шкл..рэзны, шкл..падобны, ча..ўборачны, ча..піцце, смецц..ўборачны, насенн..водства, насенн..ачышчальны, рады..эфір.

**30.** Вызначце, як утвораны складаныя словы. Устаўце прапушчаныя літары і растлумачце іх правапіс.

Выс..кагорны, др..бназярністы, кар..ткашэрсны, д..ўгатэрміновы, выс..кагатунковы, зак..напраект, ц..мнаколерны, ц..мналісцёвы, л..дасховішча, л..дадрабілка, л..гкаатлетычны, л..гкаплаўкі, м..даносны, м..даварэнне, пр..стамоўны, пр..сталінейны, ч..рнашэрсны, ч..рнапарэчкавы, бав..ўнасеяльны, бав..ўнапрадзенне, ш..ўкаводка, ш..ўкапрадзільны, т..нкаслаёвы, т..нкаструнны,

**31.** Вызначце, ад якіх слоў і якім спосабам утвораны запісаныя ніжэй словы.

Абнадзеіць, абмежаванасць, абмеркаванне, аздаравіць, акаймаваць, акраец, апытальнік, аргументаванне, асірацелы, асірацець, безыменны, белакаменны, беражліва, бестактоўна, вербалозавы, жаласны, зарысоўка, заўвага, застрэшак, зачырванелы, знарок, знаходлівы, значэнне, знізу, знішчэнне, нехаця, паддоследны, падпечак, падправіць, хтосьці, падсістэма, папаратнік, папаўзці, паўтараметровы, радыёаматарскі, радыёвузел, удзевяцярыць, удваіх, углыб, узбагачэнне, чуллівы, штомесячна, этычны, юннат, ямчэць, язмінавы.

**32.** Запоўніце пропускі ў словаўтваральным ланцужку:

1) Іней → інец → .. → заінелы;
2) вабіць → прывабіць → .. → прываблівасць;
3) жыць → .. → жыццёвы → жыццёвасць;
4) стаць → адстаць → .. → адсталасць;
5) зіма → .. → перазімаваць → перазімоўка;
6) плакаць → плакса → .. → плаксівасць.
7) трывога → трывожыць → устрывожыць → .. → устрывожанасць;
8) каса → касіць → .. → пакос;
9) хваляваць → усхваляваць → .. → усхвалявана.

**33.** Падзяліце на марфемы выдзеленыя словы.

1) *Каўзанешся* па лёдзе – *затрашчыць*, але *вытрымае*, толькі *затчэцца мудрагелістымі* ўзорамі драбнюткіх трэшчынак. (Р. Ігнаценка) 2) Хвалі *пераліваліся ружовымі* і зеленаватымі адценнямі. 3) *Запярэсцілі*, радуючы вока, *рознакаляровыя* краскі на *ўзмежках*. (Т. Хадкевіч) 4) Сонца грэе, *прыпякае*, лёд на рэчцы *затрашчаў*. Цёплы вецер *павявае*. Хмар *дажджлівых* нам прыгнаў. Вось і бусел *паказаўся*, гусі дзікія гудуць, шпак на дубе *расспяваўся*, жураўлі ўжо лятуць. (Я. Колас) 5) *Эстэтычнае* выхаванне словам *пачынаецца* з *развіцця*, з *узбагачэння пачуццяў*. (В. Вітка) 6) Вузкая дарожка, *утаптаная грыбнікамі,* віецца праз густы лес. *Убок* не *ступіць:* гушчар *непралазны*. (З. Бяспалы) 7) Ціхая *вуліца* на паўночна-ўсходняй *ускраіне* горада вядзе да *невялічкай* рэчкі, якая плыве між пахілых *прыбярэжных* вербаў. (В. Палтаран) 8) Юшка была *з'едзена*, наконт будучага *падарожжа* было *дамоўлена* і хлопчыкі ўжо *збіраліся развітацца*, каб *пайсці дадому*. (Ул. Шахавец) 9) Насенне *павыспявала* і зараз *спяшаецца* як мага далей *адляцець*,

там *прызямліцца.* (Я. Сіпакоў) 10) *Раніцою і ўвечары кусаецца* мароз. (У. Ягоўдзік) 11) Так і *засталася Лісіца* з *разяўленым* ротам. 12) Не *наглядзецца* на воблакі ў *бязветраны* дзень. (І. Грамовіч) 13) Жоўты лісцік *тапаліны ціха* падае з галіны. (С. Грахоўскі) 14) *Раней*, помніцца, дрэвы раслі такія *высозныя,* што шапка *звальвалася*, калі хацеў *паглядзець* на *вяршыні.* (Б. Сачанка) 15) Побач з сур'ёзнасцю, лірызмам, *душэўнымі перажываннямі* сустракаем эпізоды, у якіх ярка *праяўляюцца* элементы сатыры. (А. Казлоў)

## АДКАЗЫ

**1.** Лопух□, смеласць□, дождж□, музей□, боль□, школ□, армій□, думак□, ліній□, частак□, касц**ей**, мыш**эй**, зёлак□, дзвяр**эй**, імён□; малад**ы**, лясн**ая**, добр**ае**, алавян**ую**, гатоў□, згодн**ая**, згодзен□, міл**ы**, міл□, ясн**ы**, ясен□; адзін□, дв**ума**, два**імі**, тр**ыма**, чатыр**ма**, чацвяр**ымі**, сям**ю**, семяр**ых**, сорак□, трыццацц**ю**, пяцц**ю**дзесяцц**ю**, дв**ума**ст**амі**, дв**ух**сот□; чый□, ён□, ян**а**, н**ас**, в**амі**, мой□, хт**о**сьці, к**ім**сьці, ч**аму**-небудзь; апрана**е**цца, куса**юц**ца, шэпч**а**цца, калыш**уц**ца, вуч**ыш**ся, насядз**іц**ца, накрыч**ыц**ца, блукал**а**, стукал**а**ся, адкрываў□, дазваніў□ся, купал**і**ся, стрыж**аце**ся, вуч**у**ся, ясі, яс**це**, дас**ць**, дас**це**; праведзен**ая**, зроблен**ы**.

**2.** Канчаткаў няма, так як у якасці прыкладаў прыведзены нескланяльныя запазычаныя назоўнікі, прыслоўі, дзеепрыслоўі, інфінітывы, а таксама зваротныя дзеясловы-інфінітывы, у якіх пасля формаўтваральнага суфікса ўжываецца постфікс *-ца.*

**3.** У першай групе запісаны словы, якія не маюць канчаткаў, а ў другой – словы, што маюць нулявы канчатак (збіраў□ся, пяць□дзесят□, восем□сот□).

**4.** Адмоў-н-а, касц-ян-ы, ледз-ян-е-ць, чыгун-ок-□, ліст-оў-к-а, мясц-ін-а, на-рыс-ав-а-ць.

**5.** Пры*вык*аць – пры*выч*ка; *цвет* – *цвіс*ці, *язд*а – *ездз*іць – *ездж*у – па*езд*ка; *вецер* – вятры – *ветр*у; *сон* – *сн*у; *ляп*іць – *леп*ка – *ляпл*ю; *вуч*ыць – на*вук*а; *прас*іць – *праш*энне – за*прош*аны – *прось*ба; *свет* – *світ*анне – *свяц*іць; *рак*а – *рэк*і – *рач*ны; *смех* – ус*міх*ацца – *смяш*ынка – ус*меш*ка; *кас*іць – па*кос*ы – с*кош*аны.

**6.** Ад***праўл***енне, а***сляпл***яльны, ***кармл***енне, у***слаўл***енне, ***графл***енне, уз***ноўл***ены, рас***слабл***енасць, с***томл***ены, за***рубл***іванне (у корані слова назіраецца гістарычнае чаргаванне губнога гука з губным + [л'].

**7.** Прапанаваныя словы кожнай пары роднаснымі не з'яўляюцца. У складзе гэтых слоў мы вылучаем аднолькавыя карані, якія з'яўляюцца аманімічнымі.

**8.** Гор***ш***ы, спакан***ейш***ы, дуж***эйш***ы, ***най***лепшы, ***най***прыгажэйшы; прынес***л***і, узыш***л***о, намалява***ў***, падзякава***л***і; намалява***н***ая, купл***ен***ы, узнагародж***ан***ы, вымы***т***ыя, пасіве***л***ы; прынёс***шы***, скасі***ўшы***, спл***ючы***, бер***учы***, гамон***ячы***, гавор***ачы***; леп***ш***, выш***эй***, радз***ей***, ***най***бліжэй***, най***менш.

**9.** Словаўтваральныя: пал***яв***ы ← поле, ***пера***пісаць ← пісаць, мацн***е***ць ← моцны, дабр***ын***я ← добры, чыт***ач*** ← чытаць, салаў***ін***ы← салавей, бярэз***нік*** ← бяроза, гаман***лів***ы ← гаманіць.

Формаўтваральныя: мацн***ейш***ы ← моцны, гор***ш***ы ← дрэнны (суфікс далучаецца да суплетыўнай асновы), ***най***хутчэй ← хутчэй, ***най***цікавейшы ← цікавейшы, рас*л*о ← расці, прыгаж***эйш***ы ← прыгожы, леп***ей*** ← добра (суфікс далучаецца да суплетыўнай асновы), вё***ў*** ← весці, вя***л***а ← весці, бег***л***і ← бегчы.

**10.** 1) Гара, гарысты, узгорак, горны (аднакаранёвыя словы); 2) вясёлы, весела, вяселле, весяліцца (аднакаранёвыя словы); 3) прыморскі, прыморскаму, прыморскія, прыморскае (формы слова); 4) лета, па-летняму, летні, летаваць (аднакаранёвыя словы); 5) добра, лепш, найлепей (формы слова); 6) пражылі, пражыла, пражыў, пражыло (формы слова); 7) бель, белы, пабяліць, пабелка (аднакаранёвыя словы); 8) праспявалі, праспяваўшы, праспявала, праспяваная (формы слова); 9) вясна, вёсны, вясны, вёснамі (формы слова); 10) прачытаюць, прачытала, прачытае, прачытаем (формы слова).

**11.** Лыж***н***ы ← лыжы, жыцц***ёв***ы ← жыццё, капітан***ск***і ← капітан, капа***нн***е ← капаць, заснава***льнік*** ← заснаваць, ***за***рэч***н***ы ← за ракой, дзік***ун*** ← дзікі, дзюда***іст*** ← дзюдо, гус***ян***я ← гусь, вішан***нік*** ← вішня, адпраў***к***а ← адправіць, выплат⍓а ← выплаціць (бяссуфіксальны), клімат***ычн***ы ← клімат, праект***ава***ць ← праект, рыцар***ск***і ← рыцар, скал***іст***ы ← скала, сін***еч***а ← сіні, таямн***іц***а ← таемны, ***у***тро[й***і***]ць ← трое.

**12.** Падпіс***к***а ← падпісаць; рамантаваць → ***пад***рамантаваць; асіннік***ав***ы ← асіннік; безнадзейн***а*** ← безнадзейны; беззаганны → беззаганн***асць***; гнеў***н***ы ← гнеў; намалаціць → намалот⍓ (бяссуфіксальны); вялікі → веліч⍓ (бяссуфіксальны); выбар⍓ ← выбраць (бяссуфіксальны); гаманіць → гамон***к***а; пяць → пят⍓ы (бяссуфіксальны).

**13.** Геолаг⍓ ← геалогія (бяссуфіксальны), груз***чык*** ← грузіць, выклад***чык*** ← выкладаць, выхава***льнік*** ← выхаваць, ствара***льнік*** ← ствараць, пясн***яр*** ← песня, гандл***яр*** ← гандаль, лек***ар*** ← лячыць, шав***ец*** ← шыць, кав***аль*** ← каваць, трактар***ыст*** ← трактар, біятлан***іст*** ← біятлон, вадзі***цель*** ← вадзіць, пашт***альён*** ← пошта, мадэль***ер*** ← мадэль, гастрал***ёр*** ← гастролі, гвардз***еец*** ← гвардыя, гуртк***овец*** ← гурток, варат***ар*** ← вароты, паром***шчык*** ← паром, вайсков***ец*** ← вайсковы, ган***ец*** ← гнаць, варажб***іт*** ← варажба, весяль***чак*** ← вясёлы, вея***льшчык*** ← веяць, выбар***шчык*** ← выбары, віноўн***ік*** ← віноўны, вуч***ань*** ← вучыць, канкурс***ант*** ← конкурс, кас***ір*** ← каса, крыўдзі***цель*** ← крыўдзіць.

**14.** Станавіцца цёмным (цямн***е***ць ← цёмны); жыхар Мінска (мінч***анін*** ← Мінск); дзіцяня слана (слан***ян***я ← слон); гняздо бусла (бусл***янк***а ← бусел); станавіцца больш моцным (***уз***мацн***е***ць ← моцны); праведзены без сну (***бяс***сон***н***ы ← сон); стаць бледным (***па***блядн***е***ць ← бледны); у колькасці сямі чалавек (сям***ёр***а ← сем); які мае крылы (крыл***ат***ы ← крылы); здольны рухацца (рух***ом***ы ← рухацца); выхаванец ліцэя (ліцэ[й***і]ст*** ← ліцэй), спецыяліст па вырабе лякал (лякаль***шчык*** ← лякалы); з’явіцца сімвалам чаго-небудзь (сімвал***ічн***ы ← сімвал); служачы таможні (таможн***ік*** ← таможня); засцілацца туманам (туман***іц***а ← туман); апусціцца на зямлю (***пры***зямл***іц***а ← зямля); які не праяўляе клопату (***бес***клапот***н***ы ← клопат).

**15.** ***Ада***мкнуць, ***а***дарыць, ***ад***асобіць, ***ада***гнаць, ***ад***ахвоціць, ***а***драўнець, ***а***добрыць, ***а***дурманіць, ***а***думвацца, ***а***дубянець; ***а***баронны, ***аба***граванне, ***а***багаціць, ***аб***ымшэлы, ***аб***араць; ***па***двоіць, ***пад***воз; ***над***аконны, ***на***дакучыць, ***нада***рваць.

**16.** ***У***шанаваць, ***у***трымаць, ***у***кіснуць, ***уз***рыхліць, ***па***плыць, ***па***прасаваць, ***на***плыць, ***на***бегчы, ***за***рэкамендаваць, ***за***смуткаваць, ***за***слухаць, ***з***’ездзіць, ***раз***везці, ***рас***ставіць, ***пад***глядзець, ***над***сячы, ***ад***сыпаць, ***аб***ступіць, ***аб***страляць; ***не***калі, ***не***дзе, ***ні***куды, ***ні***як; ***не***шта, ***не***хта, ***ні***які, ***ні***чый, ***контр***атака, ***супер***заданне; ***анты***народны, ***ня***радасны (усе словы ўтвораны прыставачным спосабам. Прыставачнае ўтварэнне адбываецца ў межах адной часціны мовы: ад назоўнікаў утвараюцца назоўнікі, ад дзеясловаў – дзеясловы і г.д.).

**17.** Папярэдж***анн***е, папярэджва***нн***е, утойва***нн***е, усыха***нн***е, усяч***энн***е, усхвал***енн***е, утаймава***нн***е, ухіл***енн***е, утрыма***нн***е, ушанава***нн***е, уяўл***енн***е, услаўл***енн***е, збліж***энн***е, здар***энн***е, паслабл***енн***е, адрадж***энн***е, тлумач***энн***е, запазыч***анн***е, узнагародж***анн***е.

**18.** Чырвань ← чырвоны, глыб ← глыбокі, шыр ← шырокі, сінь ← сіні, бель ← белы, асцярога ← асцерагацца , нейтрал ← нейтральны; звон ← звінець, намалот ← намалаціць, падыход ← падыходзіць, стук ← стукаць, адрыў ← адрываць, адліў ← адліваць, адлёт ← адлятаць, адказ ← адказваць, адвод ← адводзіць, выкуп ← выкупіць, залік ← залічыць, замена ← замяняць, запас ← запасціся, настой ← настойваць, пералік ← пералічыць, праезд ← пераязджаць, недабор ← недабраць; адзіны ← адзін; шосты ← шэсць; залаты ← золата, воўчы ← воўк, мядзведжы ← мядзведзь (усе словы ўтвораны бяссуфіксальным спосабам).

**19.** Усе абстрактныя назоўнікі ўтвораны ад асноў прыметнікаў суфіксальным спосабам (пры дапамозе суфікса ***-асць***).

**20.** Міхас***ёў*** ← Міхась, Вас***ев***а ← Вася, Алес***ін***а ← Алеся, Алес***ев***а ← Алесь, Мікол***аў*** ← Мікола, цётч***ын*** ← цётка, Зос***ін*** ← Зося, матул***ін***а ← матуля, бацьк***аў*** ← бацька, дзед***аў*** ← дзед, Пец***еў*** ← Пеця, ліс***ін***ы ← ліса, пчал***ін***ы ← пчала, бусл***ав***а ← бусел, камар***ын***ы ← камар, жонч***ын***а ← жонка, дзіц***яч***ы ← дзіця, хлапеч⍓ы ← хлопец (бяссуфіксальны).

**21.** Аптэкар***ск***ая работа, аптэч***н***ы кіёск; баеч***н***ы жанр, байк***ав***ы халат; балот***н***ая птушка, балоц***іст***ая мясцовасць; брыльянт***ав***ы пярсцёнак, брыльянц***іст***ы блеск; грунт***ав***ыя воды, грунт***оўн***ыя веды; разліва***чн***ы цэх, разліва***льн***ы чарпак; слоў***н***ы выраз, слоўнік***ав***ы артыкул; запас***лів***ы чалавек, запас***н***ы выхад; заліў***н***ы луг, залів***іст***ы голас; зуб***аст***ы шчупак, зуб***н***ы боль; перамен***н***ы поспех, перамен***лів***ы настрой; даход***лів***ы выклад думак, даход***н***ы занятак.

**22.** ***За***мор***ск***і, ***пры***дарож***н***ы, ***пры***меж***н***ы, ***пры***сцен**н**ы, ***па***гадзін**н**ы, ***па***гад***ов***ы, ***бяс***хмар***н***ы, ***па***граніч***н***ы, ***без***мароз***н***ы, ***бес***карыс***н***ы, ***бяз***мер***н***ы, ***бяз***зор***н***ы, ***пры***чыгунач***н***ы (усе прыметнікі ўтвораны прыставачна-суфіксальным спосабам).

**23.** Усе словы ўтвораны прыставачна-бяссуфіксальным спосабам.

**24.** Усе словы ўтвораны складана-бяссуфіксальным спосабам.

**25. Складана-суфіксальны**: аднатомны, белакачанны, водалячэбны, легкаплаўкі, кукурузаўборачны, нізкасортны, святлоадчувальны; **суфіксальны:** аднабаковасць, беларусізм, водападзельны, святлолюбівасць, каракуляводства, легкадумнасць, ледакольны, лесазаводскі, нізкасортнасць, землеўладальніцкі.

**26.** Адхіл***ен***ы, засея***н***ы, адурман***ен***ы, адточ***ан***ы, адтопл***ен***ы, адшліфава***н***ы, аплака***н***ы, астудж***ан***ы, асудж***ан***ы, асуш***ан***ы, асэнсава***н***ы, выгарадж***ан***ы, вывея***н***ы, вывуч***ан***ы, вывер***ан***ы, выгруж***ан***ы, выкача***н***ы, выкарчава***н***ы, выкармл***ен***ы, выкупл***ен***ы, выкрасл***ен***ы, вылая***н***ы, выліч***ан***ы, вымера***н***ы.

**27.** **У**шыр□, **у**глыб□, **у**высь□, **у**восень□, **з**боч□ (прыставачна-бяссуфіксальны); умел***а***, прыемн***а***, коратк***а***, даходлі***ва*** (суфіксальны); ***да***верх***у***, ***у***весн***у***, ***у***гар***ы***, ***з***надворк***у*** (прыставачна-суфіксальны); ***з***больш***ага***, ***у***рассыпн***ую***, ***з***блізк***у***, ***па***-дзіцяч***ы***, ***па***-наш***аму***, ***па***-сяброўск***у*** (прыставачна-суфіксальны); **у**тра[й***я***], ***у***чацвяр***ых***, ***у***шасц***ёх*** (прыставачна-суфіксальны); ***за***многа, ***ня***шмат (прыставачны).

**28.** а) тума**нн**ы, сцюдзё**н**ы, блі**нн**ы, будзё**нн**ы, здараве**нн**ы, палымя**н**ы, племя**нн**ы, бадмінто**нн**ы, бало**нн**ы, бараба**нн**ы, форме**нн**ы, бая**нн**ы, безабаро**нн**ы, безвітамі**нн**ы, беззага**нн**ы, клятве**нн**ы, вогне**нн**ы, страшэ**нн**ы.

б) бе**сс**южэтны, бе**сс**мяротны, бе**с**тэрміновы, бе**сс**ардэчны, бе**с**хрыбетны, бе**с**цялесны, бя**сс**уфіксальны, бя**с**форменны, бе**сс**аромны, бя**с**крылы, бя**с**хмарны, бя**сс**нежны, бя**с**колерны; ра**сс**лабленне, ра**сс**трэл, ра**с**адны, ра**сс**яваць, ра**с**ольнік, ра**сс**цілаць, ра**сс**ыпістасць, ра**сс**якаць, ра**сс**яленне, ра**с**таваць, ра**с**тасаваць, ра**с**таптаць, ра**сс**ядлаць, ра**сс**ыханне, ра**сс**ыпістасць.

**29.** Пуц**е**ўкладчык (складана-суфіксальны), пуц**я**водны (складана-суфіксальны), жыцц**е**апісальны (складана-суфіксальны), жыцц**я**радасны (складана-суфіксальны), зерн**е**сушылка (складана-суфіксальны), зерн**я**склад (асноваскладанне), сво**е**часовы (складана-суфіксальны), сва**я**вольны (складана-суфіксальны), земл**е**капалка (складана-суфіксальны), земл**я**мерны (складана-суфіксальны), ільн**о**пастаўкі (асноваскладанне), ільн**о**апрацоўка (асноваскладанне), святл**о**любівы (складана-суфіксальны), пыл**а**ачышчальнік (асноваскладанне), шкл**а**рэзны (складана-суфіксальны), шкл**о**падобны (асноваскладанне), ча**е**ўборачны (складана-суфіксальны), ча**я**піцце (асноваскладанне ад *піццё чаю* (1) ці складана-суфіксальны ад *піць чай* (2)), смецц**я**ўборачны (складана-суфіксальны), насенн**я**водства (складана-суфіксальны), насенн**е**ачышчальны (складана-суфіксальны), рады**ё**эфір (словаскладанне).

**30.** Выс**а**кагорны (складана-суфіксальны), др**о**бназярністы (складана-суфіксальны), кар**а**ткашэрсны (складана-суфіксальны), д**о**ўгатэрміновы (складана-суфіксальны), выс**о**кагатунковы (складана-суфіксальны), зак**о**напраект (асноваскладанне), ц**е**мнаколерны (складана-суфіксальны), ц**ё**мналісцёвы (складана-суфіксальны), л**е**дасховішча (асноваскладанне), л**ё**дадрабілка (складана-суфіксальны), л**ё**гкаатлетычны (складана-суфіксальны), л**е**гкаплаўкі (складана-суфіксальны), м**е**даносны (складана-

суфіксальны), мёдаварэнне (асноваскладанне ад *варэнне мёду* (1) ці складана-суфіксальны ад *варыць мёд* (2)), пр**а**стамоўны (складана-суфіксальны), пр**о**сталінейны (складана-суфіксальны), ч**а**рнашэрсны (складана-суфіксальны), ч**о**рнапарэчкавы (складана-суфіксальны), бав**а**ўнасеяльны (складана-суфіксальны), бав**о**ўнапрадзенне (асноваскладанне), ш**а**ўкаводка (суфіксальны), ш**о**ўкапрадзільны (складана-суфіксальны), т**о**нкаслаёвы (складана-суфіксальны), т**а**нкаструнны (складана-суфіксальны).

**31.** **Аб**надзе[й**і**]ць ← надзея (прыставачна-суфіксальны), абмежаван**асць** ← абмежаваны (суфіксальны), абмеркава**нн**е ← абмеркаваць (суфіксальны), **а**здарав**і**ць ← здаровы (прыставачна-суфіксальны), **а**кайм**ава**ць ← кайма (прыставачна-суфіксальны), **а**кра[йэ**]ц** ← край (прыставачна-суфіксальны), апыта**льнік** ← апытаць (суфіксальны), аргументава**нн**е ← аргументаваць (суфіксальны), асіраце**л**ы ← асірацець (суфіксальны), **а**сірац**е**ць ← сірата (прыставачна-суфіксальны), **без**ым**енн**ы ← імя (прыставачна-суфіксальны), *белакамен***н**ы ← белы камень (складана-суфіксальны), беражлів**а** ← беражлівы (суфіксальны), бестактоўн**а** ← бестактоўны (суфіксальны), вербалоз**ав**ы ← вербалоз (суфіксальны), жалас**н**ы ← жаласць (суфіксальны), зарысоў**к**а ← зарысаваць (суфіксальны), заўваг□а ← заўважыць (бяссуфіксальны), **за**страш**ак** ← страха (прыставачна-суфіксальны), зачырване**л**ы ← зачырванець (суфіксальны), **з**нарок□ ← наракаць (прыставачна-бяссуфіксальны), знаход**лів**ы ← знаходзіць (суфіксальны), знач**энн**е ← значыць (суфіксальны), **з**ніз**у** ← ніз (прыставачна-суфіксальны), знішч**энн**е ← знішчаць (суфіксальны), **не**хац**я** ← хацець (прыставачна-суфіксальны), **пад**дослед**н**ы ← дослед (прыставачна-суфіксальны), **пад**печ**ак** ← печ (прыставачна-суфіксальны), **пад**правіць ← правіць (прыставачны), хто**сьці** ← хто (постфіксальны), **пад**сістэма ← сістэма (прыставачны), папарат**нік** ← папараць (суфіксальны), **па**паўзці ← паўзці (прыставачны), *паўтараметр***ов**ы ← паўтара метра (складана-суфіксальны), радыёаматар**ск**і ← радыёаматар (суфіксальны), радыёвузел ← рыдыё, вузел (словаскладанне), **у**дзевяцяр**ы**ць ← дзевяцера (прыставачна-суфіксальны), **у**два[й**і]х** ← дво[йэ] (прыставачна-суфіксальны), **у**глыб□ ← глыб (прыставачна-бяссуфіксальны), узбагач**энн**е ← узбагачаць (суфіксальны), чул**лів**ы ← чулы (суфіксальны), штомесячн**а** ← штомесячны (суфіксальны), этыч**н**ы ← этыка (суфіксальны), юннат ← *юн*ы *нат*ураліст (складанаскарочанае слова), ямчэць ← ёмкі (суфіксальны), язмін**ав**ы ← язмін (суфіксальны).

**32.** 1) Іней → інець → **заінець** → заінелы; 2) вабіць → прывабіць → **прываблівы** → прываблівасць; 3) жыць → **жыццё** → жыццёвы → жыццёвасць; 4) стаць → адстаць → **адсталы** → адсталасць; 5) зіма → **зімаваць** → перазімаваць → перазімоўка; 6) плакаць → плакса → **плаксівы** → плаксівасць; 7) трывога → трывожыць → устрывожыць → **устрывожаны** → устрывожанасць; 8) каса → касіць → **пакасіць** → пакос; 9) хваляваць → усхваляваць → **усхваляваны** → усхвалявана.

**33.** 1) *Каўз-а-н-еш-ся, за-трашч-ыць, вы-трым-а-е, за-тч-э-цца мудр-агел-іст-ымі*; 2) *пера-лі-ва-л-і-ся руж-ов-ымі*; 3) *за-пярэсц-і-л-і, розн-а-*

*каляр-ов-ыя, уз-меж-к-ах*; 4) *пры-пяк-а-е, за-трашч-а-ў-□, па-вя-ва-е*; *дажджлів-ых, па-каз-а-ў-□-ся, рас-с-пя-ва-ў-□-ся*; 5) *эстэт-ыч-н-ае, па-чын-а-е-цца, развi-цц-я, уз-багач-энн-я, па-чу-цц-яў*; 6) *у-тапт-а-н-ая, грыб-н-ік-амі, у-бок-⌂, с-туп-і-ць, не-пра-лаз-н-ы*; 7) *вул-іц-а, ус-кра[й-і]н-е, не-вял-іч-к-ай, пры-бярэж-н-ых*; 8) *з-'едз-ен-а, па-дарожж-а, да-моўл-ен-а, з-бір-а-л-і-ся, раз-віт-а-ц-ца, пайс-ці да-дом-у*; 9) *па-вы-спя-ва-л-а, спяш-а-е-цца, ад-ляц-е-ць, пры-зямл-і-ц-ца;* 10) *ран-іц-ою, у-вечар-ы, кус-а-е-цца;* 11) *за-ста-л-а-ся, Ліс-іц-а, [раз]яўл-ен-ым*; 12) *на-глядз-е-ц-ца, бяз-ветр-ан-ы*; 13) *тапал-ін-ы, ціх-а*; 14) *ран-ей, выс-оз-н-ыя, з-валь-ва-л-а-ся, па-глядз-е-ць, вярш-ын-і;* 15) *душ-эўн-ымі, пера-жы-ва-нн-ямі, пра-яўл-я-юц-ца.*